**Сэм*а* Дум*а*н**

Узрост: 22 гады

З’яўляецца студэнткай Універсітэта Боазыдж*ы* (г. Стамбул), аддзяленне турэцкай мовы і літаратуры. Піша вершы.

**Музей заходу Сонца**

Як патлумачыць, што рукі
любяць заходы Сонца,
гукі голасу ў паветры,
Журботу кветак, што вырасціў сам?
Як патлумачыць,
што вейкі прагнуць узнесціся ў неба?
Ці будзе далёкім тое,
чыю вышыню схавае карціна?
Ці застаюцца сляды на вятрах?
Калі сузіраю
мора, загнанае ў рамку,
каляровыя пералівы ў хвалях,
ці адлюструюць дзённыя фарбы
бліскучую далячынь?
Калі загашу стомленасць ад небыцця
і ўвечары
прыслухаюся да цьмянага святла,
ці абудзіць гэта ўсю лёгкасць цудаў,
і дакладнасць словаў,
і невыразнасць пачуццяў?

Калі намалюю аблокі,
ці захавае памяць
вандроўныя думкі
пасля вяртання?

Хай прыезд будзе пампезным
і будзе мала расстанняў,
хай тысячу раз зарачэцца цягацца па свеце,
таму што
я хачу назапасіць адчуванне ягоных крокаў.
Мая душа схаваная ў іх,
вам зразумела?